ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
26 лістапада 2014 г. № 163

# Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2012 г. № 101

На падставе падпунктаў 4.6 і 4.26 пункта 4 Палажэння аб Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2011 г. № 1049 «Об изменении, дополнении и признании утратившими силу некоторых постановлений Правительства Республики Беларусь по вопросам образования», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці ў Інструкцыю аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі (акрамя педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу ўстаноў вышэйшай адукацыі), зацверджаную пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2012 г. № 101 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 20.10.2012, 8/26473; 13.05.2014, 8/28651), наступныя змяненні і дапаўненне:

1.1. у пункце 6 словы «і пунктам 19» замяніць словамі «, пунктамі 19 і $20^1$»;

1.2. у абзацы трэцім часткі першай пункта 18 словы «выпадку, які прадугледжаны пунктам 20» замяніць словамі «выпадкаў, якія прадугледжаны пунктамі 20 і $20^1$»;

1.3. у пункце 19:

1.3.1. у частцы першай:

словы «другой кваліфікацыйнай катэгорыі» замяніць словамі «другой і першай кваліфікацыйных катэгорый»;

словы «першай, вышэйшай, а таксама» замяніць словамі «вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі і»;

1.3.2. у частцы пятай словы «пяць гадоў» замяніць словамі «чатыры гады»;

1.4. дапоўніць Інструкцыю пунктам $20^1$ наступнага зместу:

«$20^1$. У выключным выпадку педагагічны работнік па хадайніцтве кіраўніка арганізацыі сістэмы адукацыі ці ІП або атэстацыйнай камісіі без уліку прысвоенай раней кваліфікацыйнай катэгорыі і (або) стажу працы на пасадзе, па якой ён праходзіць атэстацыю, можа быць дапушчаны да атэстацыі на прысваенне першай кваліфікацыйнай катэгорыі са згоды начальніка ўпраўлення адукацыі абласнога выканаўчага камітэта (старшыні камітэта па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта), на прысваенне вышэйшай – са згоды Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь.».

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Міністр** **С.А.Маскевіч**

УЗГОДНЕНА
Першы намеснік
Міністра працы
і сацыяльнай абароны
Рэспублікі Беларусь
П.П.Грушнік
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Міністр спорту і турызму
Рэспублікі Беларусь
А.І.Шамко
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Міністр культуры
Рэспублікі Беларусь
Б.У.Святлоў
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Міністр аховы здароўя
Рэспублікі Беларусь
В.І.Жарко
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Намеснік старшыні
Беларускага прафесійнага
саюза работнікаў
адукацыі і навукі
Р.В.Дапіра
25.11.2014

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага гарадскога
выканаўчага камітэта
А.В.Шорац
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Брэсцкага абласнога
выканаўчага камітэта
К.А.Сумар
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.А.Дворнік
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.В.Краўцоў
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Віцебскага абласнога
выканаўчага камітэта
А.М.Косінец
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага абласнога
выканаўчага камітэта
С.Б.Шапіра
26.11.2014

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
П.М.Руднік
26.11.2014